Cana asobnaha numaru 20 hr.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 11 (556). Wilnia, Niadziela 4 Sakawika 1934 h. Hod X (XVIII).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adres Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčynienа ad 9 ran. da 4 hadz. wieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

„Biel. KRYNICA" kaštuje na hod—4 zał., na pałhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja darażej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

Милюков—Литвинов.

Расейскі барын Милюков, адзін з выдатнейшых павадыроў конституцыйна-дэмакратычнае партыі, заўсёды дзейны палітык, апынуўшыся на эміграцыі, не перастае займацца палітыкай. Рухлівы і заборчы, як і за даўнейшых часоў, агрызаючыся з эсэраўшчынай Керэнскага, ён і дасюль не перастаў берагчы і «собирать искани русскія земли» пад крыло «матушки» Масквы. Да шпіку вялікадзяржаўнік, пад гэтае „крыло" гатоў прыхінуць усе славянскія народы. Як вялікадзяржаўнік, Мілюков разглядае «инородцев» і славянскія «меншыства, населяющія русскія земли», як парабкоў Масквы, вырашэньне долі якіх залежыць ад вялікае і недзялімае Расеі. Паводле яго цяпер «адарваўшымся расейскім правінцыям» у будучыне можна будзе забясьпечыць нацыянальна-культурную аўтаномію, урэшце-ж зьдзейсьнена гэта будзе на толькі, на колькі вялікадзяржаўныя інтарэсы Расеі будуць мець у гэтым патрэбу.

Старыя расейскія палітыкі зорна сочаць за ўзростам вызваленчага руху сярод беларусаў і ўкраінцаў, стараючыся гэты рух прыдушыць і заглушыць. Калі ў першыя дні расейскае рэволюцыі голасна загаварылі ўкраінцы, паставіўшы рубам пытаньне аб самастойнасьці і незалежнасьці, расейскія палітыкі ня толькі з лагеру Мілюкова завылі павоўчаму, але і эс-эры ўбачылі «здраду рэволюцыі» у дамаганьнях украінскага народу. Тагочасны „дыктатар" рэвалюцыйнае Расеі Аляксандар Керэнскі гэтак сама не на жарт абураючыся, хуліў украінскі «сэпэратызм» і «гайдамацкую няўдзячнасьць». Калі-ж украінскі пр[illegible]парлямант — Раду разагналі немцы штыхамі, пасадзіўшы ўгодлівага генэрала Скарападзкага, расейцы пасьпешна прывозілі з Масквы цэлымі шалонамі чорнасоценнае чынавенства і афіцэраў у Кіеў, каб перастварыць гэную „незалежную" дзяржаву ў частку „единой Россіи". Кіеў — гэтая сталіца ўкраінскага народу — ператварылася ў 1918 годзе ў „матушку" Маскву і чулі сябе там маскалі, як ў сябе дома, пазаймаўшы вышэйшыя становішчы у «батьки» гэтмана, які афіцыяльна зрокся «мазэпінства і сэпэратызму» на карысьць фэдэрацыі з Расіяй. Заграніцаю-ж асабліва ў Францыі, дзе знаходзіўся „ключ", пры помачы якога можна было адчыніць браму для жыцьця абудзіўшыхся беларусаў, украінцаў і іншых, царскія палітыкі, карыстаючыся сваімі дыплёматычнымі і асабістымі ўплывамі, стараліся заўладаць гэным «ключам», каб брама засталася назаўсёды запёртай. Не гаворучы ўжо аб слабых тагды беларусах, але і палякам даліся ў знакі расейцы з лагеру Мілюковых, якія ўмела выкарыстоўваючы тагочасную міжнародную палітыку стваралі няпрыхільныя адносіны да натугаў Польшчы нат у прыяцелькі Францыі, не гаворачы ўжо аб Англіі, якая — як ведама — і да сяньняшняга дня ня мае да Польшчы добрага вока.

Паводле тае-ж дыплёмацыі з лагеру кадэтаў, паўстаўшыя пасьля расейскае рэвалюцыі прыбалтыцкія дзяржавы зьяўляюцца выключна толькі вытварам рэвалюцыі і бязладзьдзя. Латвія, Літва і Эстонія, — гэтыя невялічкія дзяржавы, — дзякуючы свайму географічнаму палажэньню, наражаючыя Расею на вялікія эканамічныя страты, зьяўляюцца косьцю ў горле вялікадзяржаўнікаў, якую пакульшто, седзячы на эміграцыі, яны ня могуць выплюнуць. Але расейская эміграцыя ня траціць надзеі, што некалі сьпіхнець «дерзких инородцев» у мора, скуль яны ўжо ніколі ня выплывуць...

Пасьля ўпадку царызму ў Расеі, на зьмену Мілюкову і ягоным таварышам з царскае дыплёмацыі прышлі новыя людзі, якіх выкінула пена рэвалюцыі, даўшы ім у рукі повад замежнае палітыкі. Сквапна за яе хапаючыся, не знайшлі аднак, сярод сваіх аднадумцаў, здольнага павадыра, які мог-бы сваёй практычнай здольнасьцю пакіраваць караблём па ўзбуранаму мору заграпічнае палітыкі. І трэ' было маскоўскім валадаром запрасіць расейскага барына, ведамага буржуазнай Эўропе дыплёмата, «таварыша» Чичерина Ён, як „спэц", спрытна павёў заграпічную палітыку С.С.Р.Р. па торах даўнейшае Расеі і, давёўшы яе ўмелаю рукой да пажаданых вынікаў, застаўся за свае заслугі выкінуты на маскоўскі брук, каб уступіць месца Літвінаву.

Жыд Литвинов, гэты апошняга сорту грамадзянін у царскай Расеі, якому нельга было пад карай пераступаць межаў «черты оседлости», сёньня з шырокім размахам разьяжджаючы па буржуазнай Эўропе, гаворыць ад імя С.С.Р.Р. Выседзяўшыся на мяккіх крэслах царскіх дыплёматаў і адпаліраваўшы сваю сэміцкую павярхоўнасьць, ён, упадабняючыся дыплёматам «его величества», горача разводзячыся аб цэласьці і непадзельнасьці імпэрыі С.С.Р.Р., задзіўляе заграніцу, а йшчэ больш вялікадзяржаўную расейскую эміграцыю.

Гэтая эміграцыя, якая йшчэ нядаўна акуратна ўпісвала кожную ахвяру бальшавіцкага тэрору ў кнігі і адпраўляла па загубленых паніхіды ў праваслаўнай царкве ў Парыжы, прызываючы гнеў Божы на галовы бальшавікоў за пакрыўджаны расейскі народ, забыўшыся аб усім, толькі не аб вялікадзяржаўнасьці, згодна й рашуча загаманіла проці «нарушенія границ» С.С.Р.Р. А Мілюкоў, як падаець заграпічная прэса, у сваей нядаўняй палітычнай мове ў Парыжы прызываў расейскую эміграцыю, каб дапамагла Маскве бараніць „русскія" землі, разумеючы пад гэтымі землямі і тыя, якія выняты з пад апекі маскоўскіх бальшавікоў — землі Заходняй Беларусі і Украіны.

Хто-б ня правіў у цяперашняй Расеі — справа малазначучая, важна тое, каб правячыя думалі й дбалі аб вялікай Расеі — кажуць «истинно русскіе люди», — пацяшаючы сябе, што Масква зьяўляецца той прыцягваючай вялікадзяржаўнцкай сілай, якая кожнага, хто пакаштуе ў ёй улады, пераробіць на вялікадзяржаўніка і асымілюе нат безнадзейнага сэміта. І праўда, адносна да бальшавікоў, у радох якіх ёсьць шмат жыдоў і іншых «инородцев», Мілюкоў не памыліўся.

Палітычная лінія маскоўскіх цароў, «собиравших русскія земли», не перарвалася і перайшла ў спадчыну і расейскім „дворянам" Милюкову і Чичерину, а яны перадалі яе жыду Литвинову, які можа гардзіцца з пaверанае яму „высокае" місіі: прадаўжаць дзела маскоўскіх цароў і душыць у межах С.С.Р.Р. паняволеныя народы, не даючы ім права нат заікнуцца аб сваім палажэньні і аб сваіх імкненьнях.

Але лёгка згадаць, што палітычная лінія Милюков—Литвинов хутка парвецца Парвуць яе паняволеныя народы, каб зьвясьці назаўсёды вялікадзяржаўніцтва Масквы, якая заўсёды клапоціцца толькі аб долі маскоўскага народу. Паняволеныя дасюль Беларусы, Украінцы і іншыя народы дадуць сабе раду і без маскоўскае апекі.

Антон Паддубіч.

З дзейнасьці Беларускага Інстытуту Гаспад. і Культуры

Дзейнасьць гуртка Б.І.Г.І.К. у Шальцінах, Браслаўскага пав., за 1933 год выглядае гэтак:

I. Урад гуртка адбыў шэсьць (6) паседжаньняў дня: 10.I 33; 12.III. 33; 5.VI 33; 8 VII.33; 19 X.33. і 27, XII 33 г.

II. Адбыліся два агульныя сходы сяброў гуртка: 1-шы дня 28.I 33 (гадавы сход), 2-гі дня 1.XI 33. (надзвычайны)

III. Зладзіў тры (3) спэктакль-вечарыны (спэктакль-вечарына з 1 I.33. улучана да справаздачы за 1932 г.).

1. У вёсцы Бабарыках (друйскай вол.) адыграны былі камэдыі: „Гурток" Я. Башкіра, „Зьбянтэжаны Саўка" і Конскі патрэт" Л. Родзевіча.

2. У в. Гер'ятах (мёрскай вол.) адыграны былі „Гурток" і „Конскі патрэт".

3. У в. Якужах (друйскай вол.) адыграны былі: „Зьбянтэжаны Саўка", Конскі патрэт" і адтанцавана на сцэне „Лявоніха". Апроч вышэйўспомненых спэктакль-вечарын, гурток зладзіў дзьве вечарыны з песьнямі бел. і танцамі ў памешканьні гуртка.

IV. Сарганізаваў два рэфэраты:

а) „Задачы і праца бел. культурна-прасьветных арганізацыяў", чытаў гр. Аўгень Аніська дня 22.X.33

б) „Аб коопэрацыі", чытаў студ. мэд. Язэп Малецкі дня 1 I 34 г.

V. Арганізаваў Урачыстае Сьвяткаваньне 15-ых Угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі з наступнай праграмай:

1. Адсьпяваньне бел. нац. гымну: „Не пагаснуць зоркі ў небе".

2. Рэфэрат на тэму: „Акт 25-га сакавіка 1918 г.", рэфэрэнт — гр. Аўг. Аніська.

3. Дэклямацыі вершаў.

Сьвяткаваньне аднак не адбылося — адміністрацыйныя ўлады не далі дазволу. Сьвяткаваньне змагло адбыцца ў гуртку, выключна для сяброў гуртка. Гр. Аўгень Аніська прачытаў рэфэрат: „Акт 25 га сакавіка 1918 г.". На заканчэньне адпяялі: „Не пагаснуць зоркі ў небе".

VI. Бібліятэка-чытальня разьвівалася добра — з кніжак карысталі ня толькі сябры (ня ўсе), але і не сябры і то пераважна з далейшых вёсак: як Мінейты, Рагнёва (леонпольскай вол.), Палейкі, Пад'ельцы, Гер'яты, Дзянісава і інш. (мёрскай вол.) У бібл. за 1933 г. паступіла 18 кніжак: 11 кніжак куплена, а 7 ахвяравана.

Цяпер бібліятэка мае 108 кніжак, пара гадавікоў „Бел. Крыніцы", гадавік «Самапомачы» і шмат іншых часопісяў (пара польскіх і ўкраінскіх).

VII. Паводле магчымасьці урад гуртка пашыраў бел. друкаванае слова, пры гэтым браў пад увагу асабліва гміну леонпольскую і мёрскую, — дзе бел. газэты і часопісі амаль што сусім не даходзяць, бо ніхто іх не выпісвае. Гурток атрымліваў: „Бел. Крыніцу" (10 экз.), „Шлях Моладзі", „Самапомач", „Chryścijanskuju Dumku" і інш.

VIII. Плян працы на будучыню:

1. Урачыста адсьвяткаваць „16-я Угодкі Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі".

2. Ладзіць лекцыі на рожнародныя тэмы, аднак асаблівую ўвагу зьвярнуць на лекцыі з тэмамі гаспадарчымі і коопэратыўнымі (гэтым самым прыгатаваць грунт пад коопэрацыю).

3. Ставіць спэктакль-вечарыны, далучаючы да іх сьпевы і дэклямацыі.

4. Пашыраць бел. друкаванае слова.

5. Арганізаваць вечарыны з бел. песьнямі і „Лявоніхай".

6. Зьбіраць беларускія народныя песьні, прыпеўкі і інш.

7. Здабываць новых сяброў.

8. Дамагацца беларускіх казаньняў у касьцеле і царкве. На апошнім агульным сходзе (з дня 18.II.34 г.) пастаноўлена вясьці хроніку гуртка, гэтай справай даручана заняцца гр. Алене Аніська.

За 1933 год у гурток паступіла шэсьць (6) папераў, а вышла (13) трынаццаць. Стан касы за 1933 г.: усяго даходу 118 зл. 27 гр., усяго расходу 107 зл. 41 гр. Сальдо на 1934 г. 10 зл. 86 гр.

Агульны сход сяброў гуртка з дня 18.II.34 г. выбраў урад гуртка ў гэтакім складзе:

старшыня — Алена Аніська з Шальцін, сэкрэтар — Пятро Кашкур з Рагнёва, леонпольскай вол., скарбнік — Язэп Урбановіч з Цілеўшчыны, 1 заступ. Язэп Цьвячкоўскі, 2 — Леокадыя Цьвячкоўская.

Гурток мае ўсяго трынаццаць сяброў і надалей месьціцца ў доме Цыпрыяна Каралёнка ў Шальцінах. Загадчыкам бібліятэкі-чытальні і адказной за яе зьяўляецца сяброўка Алена Аніська.

Centralny Urad Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury prypaminaje hurtkom: ŭ Miednikach, Kiejpunach, Juškach, Ikaźni, Rubiažewičach, Zadworji, Lachawičach, Nowaj Myšy, Daniušawie, Ješkawičach, Arlaniatach, Miadźwiedzičach i ŭsim inšym, jakija dahetul nia prysłali sprawazdačy, ab abawiazku prysyłki sprawazdačy z dziejnaści za 1933 hod na adras Instytutu: Wilnia, Zawalnaja 1.

З царкоўнага пагосту.

Аб царкоўных справах у Смаргонях.
(*Ашмяншчына*).

Смаргонскі праваслаўны прыход складаецца з чысьцюсенькіх Беларусаў. Ёсьць некаторыя праваслаўныя з самага м. Смаргоняў, якія яшчэ дыхаюць маскоўшчынай, але такіх вельмі мала. Прыход вялікі, даволі багаты, калі параўняем яго з іншымі. Падчас сусьветнай вайны смаргонская прыходская царква Спаса Прэображэнскага была амаль зусім зьнішчана, як зьнішчаныя былі самыя Смаргоні. Ад царквы перадваеннай асталіся толькі сьцены пабітыя снарадамі і кулямі. Сягоньня царква хораша выглядае, адрэмантавана ад асноў, — пакрыта бляшаным дахам,адным словам,— якбы і ня было вайны. А да такога сяньняшняга выгляду царквы давяла мазалістая рука праваслаўнага Беларуса смаргонскага прыходу. Праваслаўны Беларус смаргонскага прыходу, як гэта здарылася і па другіх прыходах, — сам зьнішчаны матэр'яльна вайной, сам паўстаючы на ногі па сусьветнай і польска-бальшавіцкай суматосе, не пакінуў і сваей царквы: паставіў і яе на ногі. Ды ня толькі ён адбудаваў царкву. У Смаргонях ёсьць таксама два прыходскія будынкі, у якіх — у адным жыве сьвяшчэньнік, а ў другім псаломшчык. І гэтыя будынкі пабудаваны з ахвярнасьці смаргонскіх прыхаджан. Ясная рэч, паміма адбудовы царквы, усяго яшчэ ў ёй не хапае. Апошнімі гадамі ўстроілі ў царкве званы. Званы—добрая рэч, царква ня можа ў нармальныя часы без іх абыйсьціся. Але трэба на іх грошы. А хто-ж іх дасьць? Можа маскаль з Масквы? Не! Той-жа праваслаўны Беларус, сярмяжнік, які часта сам будучы пры зацірцы ці поліўцы пасьледні пуд аддаець папу на званы. Нядаўна наш сьвяшч. Роўда хваліўся ў царкве, што яму нейкія ўдовы з плачам (мусіць умеў падыйсьці да іх.—рэд.) давалі на званы пасьледні пуд!...

Абслугоўваюць царкву два сьвяшчэньнікі: настаяцель а. Роўда, які ў нас ёсьць некалькі гадоў, і нібы яго памоцнік а. Валконскі, які нядаўна да нас зьявіўся. Трымаюць яны ў царкве моцна маскоўшчыну.

Сьвяшч. Роўда — нібы беларус,— у прыватнай гутарцы з прыхаджанамі гаворыць, і нават добра,пабеларуску. А ў царкве, дык пабеларуску не гавора, калі ня лічыць таго, што ў пропаведзях, бывае, ужые якога беларускага слова. У школах, тлумачачы праўды Хрыстовай веры дзецям, ужывае мовы ні то маскоўска-расейскай, ніто беларускай, гаворыць ён проста нейкай мяшанкай-трасянкай. Дык і крыўда-ж, вялікая крыўда робіцца нам Беларусам гэтымі царкоўнымі служкамі, якія, замест ужываць мовы, якой народ гавора, гавораць у царкве да беларускага народу памаскоўску.

* * *

Дня 15-га лютага с. г. адбылося ў Смаргонях сабраньне царкоўных апякуноў („папячыцеляў"), на якім гэныя апякуны абгаварывалі справу кватэраў для нашых сьвяшчэньнікаў і іх двух псаломшчыкаў, а гэта ў зьвязку з ведамым ужо крызысам і зьменай асабовай праваслаўнага кліру (прыехаў да нас нядаўна сьвяшч. Валконскі). Справа ў тым, што кожны з гэтых царкоўных служак хоча мець выгоду і жыць у асобным доме. Ведама, наш прыход не такі ўжо багаты, каб ім і ў гэтым дагадзіць. Перашкаджае так-жа ў гэтым і крызыс, які жорстка адчуваець на сабе нашае сялянства. Дык царкоўныя апякуны на гэным сабраньні гаварылі, што з царкоўных даходаў ня трэба даваць кватэрных на асобныя дамы псаломшчыкам, а воляй апякуноў было, каб з двух прыходскіх дамоў — адзін — надта важны дом — аддаць для пражываньня абоім сьвяшчэньнікам, а другі дом аддаць іхнім абоім псаломшчыкам. Дык гдзе-ж там! Сьвяшч. Роўда, у адказ на такую гутарку і раду царкоўных апякуноў, груба сказаў, што не дапусьціць да гэтага і што ня „згодзіцца" з гэтым царква Спаса Прэабражэнскага! Адным словам, наш сьвяшч. Роўда хоча выгоды, хоць могбы яе мець і тады, калі-б жыў у адным доме з другім сьвяшчэньнікам. Хоча ён выгоды, якая робіцца коштам сьлёз і поту нашага сярмяжніка Беларуса.

Наш народ надта добры і цярплівы. Але ўжо чаша цярплівасьці напоўнена і народ пачынае ўжо думаць, як выгнаць з царквы маскоўшчыну і слугаў маскоўшчыны ў царкве, якія, дзеля асабістых сваіх выгодаў, не шкадуюць сьлёз і поту гаротнага Беларуса.

Беларусе! Аніводнага граша ня дай тым, хто ўсільна дзяржыць у царкве маскоўшчыну, як і тым, хто для сваіх выгодаў ня стыдаецца ўзяць пасьледні сьлёзны пуд! У праваслаўнай царкве на Беларусі павінна красаваць беларушчына, а не маскоўшчына, а сьвяшчэньнікі павінны жыць у выгодзе пастолькі, паскольку прыхаджане могуць ім даць!

Смаргонскі праваслаўны Беларус.

Для прыкладу іншым.

Ляхавічы, Баран. п., гэта не малое беларускае мястэчка. Ваколіцы мястэчка наскрозь беларускія. Жывуць тут праваслаўныя і каталікі. Беларуская народная сьведамасьць не малая. У праваслаўным рэлігійнацаркоўным жыцьці тут суладна. Ляхавіцкі настаяцель а. Антон Сокол-Котулоўскі зусім па хрысьціянску навучае народ без дамешкі ніякай палітыкі, ён чалавек сьветлы, гаворыць пропаведзі разумныя і зразумела, бо ў роднай мове прыхаджанпабеларуску,—у школах навучае дзяцей Закону Божага так-жа ў роднай мове—пабеларуску.

За гэта ўсё народ яго любіць і за яго стаіць гарой; народ выбірае а. Антона на павадыра і кіраўніка мяйсцовага грамадзка-эканамічнага жыцьця, а айцец Антон з свайго боку ўмела і гэтай справай кіруе. Гэтак вось у нас жыве пастыр з паствай.

Мітрафанчык.

Праваслаўны Малітваслоў

у царкоўна-славянскай і беларускай мове. Варшава, Друкарня Сынодальная, 1933, бач. 48, 15×11.

Што гэта за кніжыца — гавора дастатачна сам назоў яе. Аб яе выхадзе ў сьвет успаміналі мы ўжо ў вадным з нядаўных нумароў нашай часопісі. Цяпер-жа пазнаёмім з ёй бліжэй нашых праваслаўных чытачоў.

Як відаць з самага зьместу „Малітваслова," празначаецца ён ня толькі для прыватнага ўжытку ў хаце, але такжа й у царкве падчас Службы. Тымчасам „Малітваслоў" выданы так, што наўрад ці кожны праваслаўны набожны беларус будзе браць яго з сабой у царкву. Фармат яго—амаль не квадрат—даволі значнага размеру (15×11) — для гэтай мэты дужа нявыгодны.

Не падумалі так-жа выдаўцы і аб тым, каб адпаведна ўлажыць зьмест „Малітваслова." Уложаны ён так, што на першай бачыне знаходзяцца малітвы па царкоўнаславянску, а на другой ты-яж малітвы пабеларуску. Кожнаму ясна, што было-б куды зручней і карысьней, калі-б кожная бачына была падзелена на дзьве часьці: пярэднюю—славянскую і далейшую— беларускую У гэткім укладзе чытач, шукаючы лепшага зразуменьня малітваў царкоўна-славянскіх у беларускім тлумачэньні, не патрабаваў-бы пераварачваць бачыны аж на другі бок, бо патрэбны тэкст і славянскі і беларускі меў-бы вобак на кожнай бачыне. Словам, тэхнічны бок кніжыцы, — калі ня лічыць добрай паперы і чыстага друку,—няўдалы. Выглядае, што работа гэта—для адчэпнага.

Затое сусім інакш прадстаўляецца кніжыца з боку рэдакцыйнага. Відаць, што той, хто тлумачыў малітвы на беларускую мову і хто рыхтаваў гэны „Малітваслоў" да друку, у працу сваю ўкладаў душу. Беларуская мова даволі чыстая, тлумачэньне агулам згоднае з тэкстам стара-славянскім.

Да заганаў у беларускай мове залічаем: Гасподзь — (Госпад), ва імя (у імя), у векі вечныя (навекі) малітаўнік(малельнік,у царк.-слав.— молитвенник), дзяржава (уласнасьць(?), у царк.-сл.: достояніе), нябёсы, (неба, у беларускай мове, здаецца, неба ў множным ліку ня

„Шлях Моладзі".

(*16.II.1929 — 16.II.1934*).

Пад такім назовам ужо пяць гадоў выходзіць у Вільні месячная часопісь для беларускай моладзі Зах. Беларусі.

Гэтая часопісь пачала выходзіць дзякуючы стараньням групы беларускае моладзі, у склад якое ўваходзілі: Ізабэля Тумаш, Янка Багдановіч, Мар'ян Пецюкевіч, Альфонс Шутовіч, Уладыслаў Тарасэвіч і Язэп Найдзюк. Гэтая вось група сабраўшыся 16 лютага 1929 г. сарганізавала Рэдакцыйную Калегію і, падзяліўшы паміж сабой ролі працы, прыступіла да выдаваньня часопісі „Шлях Моладзі". За мэту ў сваей працы Рэдакцыйная Калегія ўзяла змаганьне за незалежнасьць Беларусі і за палепшаньне народнае долі шляхам буджэньня моладзі да народнае сьведамасьці, пашыраньня асьветы і культуры на вёсцы, узгадоўваньне моладзі ў самастойнанезалежніцкім духу і даваньня ў меру магчымасьцяў для моладзі добрае роднае літэратуры, разрываў і цікава-карысных вестак з жыцьця сусьвету, а так-жа і з беларускага адраджэнскага руху. За падставу часопісь узяла народную ідэолёгію, апіраючыся на хрысьціянскай этыцы.

Першы нумар „Шляху Моладзі" выйшаў у канцы лютага на сакавік 1929 г. Сёлета вось у лютым мінула гэтай часопісі пяць гадоў.

У пятыя ўгодкі працы „Шляху Моладзі" закладнікі гэтай часопісі, Рэдакцыйная Калегія і супрацоўнікі наладзілі падсумаваньне сваей працы за пяць гадоў, выказваючы гэтую суму працы на зарганізаванай імі ўрачыстай акадэміі, якая адбылася 25 лютага с. г. у залі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў Вільні.

Прыгожа ўдэкараваная нацыянальнымі адзнакамі заля запоўнілася гасьцьмі, лікам да паўтары сотні; была пераважна моладзь вышэйшых, сярэдніх і фаховых школ, а так-жа і запрошаныя старэйшае грамадзянства. За прэзыдыяльным сталом заняла месца Рэдакцыйная Калегія „Шляху Моладзі". Рэдактар часопісі Я. Найдзюк адкрывае акадэмію і дае справаздачу з дзейнасьці Рэд. Калегіі за 5 гадоў, а выразьней кажучы, — чытае добра апрацаваны рэфэрат аб працы „Шляху Моладзі" за гэты час.

З рэфэрату даведваемся, што „Шляху Моладзі" да сяньняшняга дня вышла ўжо 62 нумары, якія абымаюць 1228 бачын.

За ўвесь час надрукавана ў Шляху Моладзі": 87 артыкулаў характару ўзгадаваўчага, 38 артыкулаў агульна навукова-популярных, 31 арт. з гісторыі, 17 артыкулаў аб нашых песьнярох і іх творчасьці, 20 народных твораў (песьні і казкі) і аб іх артыкулаў, 7 аб школьніцтве, 6 аб коопэрацыі, 18 з галіны краязнаўства, 14 аб спорце, 8 аб справах рэдакцыйна арганізацыйных, 6 дыскусыйных, 9 аб арганізацыях моладзі, анкета з 25 умотываванымі адказамі ў справе: „Якімі літарамі друкаваць „Шлях Моладзі", 272 вершы, 38 апавяданьняў і інш. твораў прозай, 113 карэспандэнцыяў, 800 вестак з хронікі, 264 з усячыны і 732 адказы ў рэдакцыйнай „Паштовай скрынцы" на пісьмы падпісчыкаў і супрацоўнікаў.

Аўторамі друкаваных у „Шлях Мол." матэр'ялаў зьяўляюцца людзі розных палітычных кірункаў, розная веравызнаньня, з асьветай вышэйшай, сярэдняй і пачаткавай, а то й зусім самавукаў. Усіх супрацоўнікаў у Вільні, у краю і заграніцай „Шл. Мол." мае 82 асобы і ліча гэта ўсьцяж павялічаецца.

Лічба падпісчыкаў расьцезкожным днём, але кожны дзень прыходзіцца яе і абцінаць, бо людзі нашы з бяды, ці прывычкі хочуць атрымліваць часопісь дарма.

З атрымліваньнем падпіскі ў нармальных варунках часопісь магла-б нават да пэўнай меры пашырыць сваё выдавецтва, усё аднак дагэтуль зьядалі канфіскаты, суды за іх і штраф. Усіх канфіскатаў за 5 гадоў „Шл. М.", было 5, і кожная з іх каштавала каля 200 зл., пры тым за адну з іх заплачана 150 злотаў штрафу.

Паміма гэтага выдавецтва „Шл. Мол." выдала аднак кніжыцу п. н. „Палітычныя кірункі ў мінуўшчыне і сучаснасьці", а так-жа кішанковы календарык на 1931 год.

Спачатку „Шлях Моладзі" друкаваўся выключна гражданкай, але пасьля праведзеньня анкеты, „Якімі літарамі друкаваць „Шлях Моладзі", ад пачатку 1932 году гэта часопісь друкуецца гражданкай і лацінкай адначасна.

Так выглядае выдавецкая і рэдакцыйная праца Рэдакцыйнае Калегіі «Шляху Моладзі» за 5 гадоў. На гэтым аднак праца яе не агранічылася. Рэдакцыйная Калегія, разумеючы патрэбу шырэйшае і больш арганізаванае працы сярод моладзі, у 1929 г. ўжо пастанавіла залажыць Таварыства Беларускае Моладзі „Будучыня". Мэты гэтага Т-ва былі наступныя: а) самаадукацыя ў кірунку: народным, грамадзкім, культурным і прафэсыянальным; б) пашыраньне асьветы і навукі сярод малодшага пакаленьня; в) буджэньне зразуменьня да справы культуры

ўжываецца), ражаство (калі не нараджэньне, дык лепш — ражство, гэтак народ гавора), отча (ці нялепш — ойча, бо рэдактар-перакладчык і сам часам ужывае - айцец) і інш. Але падчоркаваем, што гэтыя недахопы мовы дробныя і, магчыма, некаторыя з іх спорныя.

На плюс, рэдактару-перакладчыку трэба залічыць і тое, што ён у тлумачэньні бадай усюды захаваў — вобак з літургічнымі —і беларускія народныя назовы сьвятаў, як Гаспажа, Пакровы, Ушэсьце, Прачыстая, Спас і інш.

Зьмест „Малітваслова“ уложаны гэтак: малітвы ранішнія, малітвы ў працягу дня, малітвы перад сном, малітвы з багаслужэньня ў царкве, трапары, кандакі, малітвы і сьціхі з трыадзі поснай цьвятной, трапары, кандакі і вялічаньні на сьвяты Гасподнія, Багародзічныя і Вялікіх Сьвятых.

Кніжыца гэта выдана з багаславенствам Мітрапаліта Дзяніса. На заканчэньне астаецца тольkі пажадаць, каб „Малітваслоў“ знашоўся ў кожнай праваслаўнай беларускай хаце!... **Кніжнік.**

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Беспадстаўныя канфіскаты „Бел. Крыніцы“. Сёлетняй зімой ужо аж трох канфіскат адміністрацыйнай уладай нашай газэты суд не зацьвердзіў. Вельмі яскрава суд матывуе апошнія дзьве пастановы, датычачыя канфіскаты „Бел. Крыніцы“, сьцьвярджаючы, што ў сканфіскаваных артыкулах няма нічога праступнага, а так-жа і знамёнаў праступства. Аднак, не зважаючы на гэта, стратаў спрычыненых канфіскатай выдавецтву „Бел. Крыніцы“ ніхто ня зьверне.

З выдавецкае нівы. Гэтымі днямі вышлі з друку за м-ц люты: „Самапомач“ — беларускі коопэратыўна-гаспадарчы журнал і „Шлях Моладзі“ — месячная часопісь беларускай моладзі.

Беларуская лекцыя праз радыё з Літвы. 18 і 19 лютага с. г. у Коўне праз радыё прачытаў дзьве лекцыі аб беларускай справе б. дырэктар Беларускай Гімназіі ў Дзьвінску С. Сахараў.

Што дзеецца там, дзе вучыцца беларуская моладзь? Па Вільні сярод беларусаў ужо даўно ходзяць чуткі, што сярод вучняў Беларускай Філіі Дзяржаўнай Гімназіі ім. Ю. Славацкага ў Вільні шырыцца камуністычная прапаганда. Аб гэтым С. Сарока ў сваей „Бел. Пр.“ піша даслоўна гэтак:

„Чырвоная маскоўская палітыка імкнецца, як ведама, зьнішчыць беларускі рух ня толькі ў межах БССР, але і тут — у Зах. Беларусі. З гэтаю мэтай маскоўскія агенты апошнім часам пачалі ізноў завіхацца каля Віленскай беларускай гімназіі. Старым спосабам іх правакацыйна-грабарская палітыка распачынаецца ізноў ад хвальбы ў „парт'ячэйках“ асобы дыр. Астроўскага. Што гэная хвальба мае азначаць, беларускае грамадзянства добра ведае. Некалькі гадоў назад, таксама пачалося ад хвальбы дырэктара, а скончылася на выдаленьні з гімназіі пад сотню вучняў“.

Думаем, што С. Сарока аб гэтым паінфармаваны дакладна і гэтыя весткі дабыў з адпаведных жарол. Дзеля гэтага, на наш пагляд, справа гэта прадстаўляецца паважна і на яе трэба зьвярнуць належную ўвагу. Тымбольш, калі да гэтага далучаецца і наступны факт: у нядзелю 25 лютага с. г. вучняў Бел. Філіі Дзярж. гімназі Ю. Славацкага афіцыяльна вадзілі на польскі рэфэрат, дзе выступаў з прамовай ведамы ў Вільні студэнт Капала, якога апэляцыйны суд нядаўна засудзіў на кару вастрогу за камуністычную прапаганду, устрымліваючы кару на некалькі гадоў.

Ня думаем, што вадзілі вучняў на гэты рэфэрат бяз ведама дырэктара Астроўскага. Калі прыпомнім, а зрэшта ўсе аб гэтым добра памятаюць, што дзеялася за часоў папярэдняга дырэктарства Астроўскага ў Віленскай Беларускай гімназіі, дык ясна стане, што пад „апекай“ Астроўскага бел. моладзь можа ўсё спаткаць. Было-ж так, што камунізм дэмаралізаваў моладзь у гімназіі, цёмныя сілы ўзрывалі школу, а дыр. Астроўскі з усім гэтым злом так „змагаўся“, што аж беларускім вучням лабы трашчэлі. Гэткая „барацьба“ яго з камуністычнай пошасьцяй сярод беларускай вучнёўскай моладзі, калі выкінулі з гімназіі каля 100 вучняў, яшчэ сьвежа ў памяці. Помнім такжа, што было з вучнямі б. беларускай вучыцельскай сэмінарыі ім. Фр. Багушэвіча, дырэктарам якой быў той-жа Астроўскі, будучы ўжо так-жа санатарам.

Ня цьвердзім, што дыр. Астроўскі сярод беларускай моладзі пашырае камунізм, але сьцьвярджаем, што камуністычная прапаганда сярод беларускай моладзі, што знаходзіцца пад яго „апекай“, пашыраецца і далей пустошыць маладыя беларускія душы.

На ўсё вышэйсказанае зварочваем увагу бацькоў і апякуноў вучняў гэтай школы, а так-жа і Бацькаўскага К-ту, заданьнем якога ёсьць дбаць і аб выхаваньні моладзі.

Лекцыі. У Т-ве Беларусаведы пры У.С.Б. дня 4-га г. м. адбудуцца дзьве лекцыі:

1) на тэму „Матэрыялы датычачыя беларускай мовы з-пад Вішнеўскага возера“. Чытае В. Тумаш;

2) на тэму „Стан языковы, этнографічны і нацыянальнага пачуцьця ў Б.С.С.Р.“, чытае др. Я. Станкевіч. Уваход вольны. Адбудуцца лекцыі ў залі VII галоўнага будынку У.С.Б. Пачатак а гадз. 5-й п. п.

Sialanie ŭ Niezaležnaj Litwie.[2)]

(*„Viln. Rytojus“ Nr. 7, 1934*).

U Nr. 6 našaj časopisi padali my ab žyćci sialan u Niez. Litwie toje, što było nadrukawana ŭ Nr. 6 „Viln. Ryt.“, a ciapier padajom kančatak ab hetaj sprawie pawodle Nr. 7 tej-ža časopisi

„Ziamielnaja reforma — čytajem tam — haspadaroŭ Niezaležnaj Litwy pastawiła na mocnyja nohi. Padzielenymi na chutary wioskami ciapier apiakujucca ahranomy i haspadarčyja arhanizacyi. Chutary arhanizujucca pad kiraŭnictwam ahranomaŭ pawodle wymohaŭ sučasnaj nawuki. Haspadarčyja arhanizacyi pamahajuć haspadarom praświačacca, tanna i dobra wyrablać haspadarčyja pradukty, pradawać ich, na dahodnych warunkach nabywać patrebnyja ziemlarobskija pryłady, nasieńnie, pošar i h. d.

Siańnia ŭ Niez. Litwie kultura ziamielnych haspadarak planowa i pastupowa pawialičwajecca. Tam imknucca da taho, kab haspadar byŭ kulturnym čaławiekam i razumnym kiraŭnikom haspadarki, jaki sam patrapiŭby ŭ roznych zdareńniach datasawacca da źmiennych warunkaŭ žyćcia, da nowych patreb i kab z swajej haspadarki atrymaŭ jaknajbolš karyści.

U Niez. Litwie jość Ziamielna-haspadarčaja Akademija (u Datnowie), jakaja pryhataŭlaje ahranomaŭ, instruktaraŭ paasobnych halin haspadarki i inšych ziamielna-haspadarčych rabotnikaŭ. Aprača hetaha jość tam šmat siarednich i nižejšych ziamielna-haspadarčych škoł, katoryja šmat pryhataŭlajuć haspadarčych specyjalistaŭ-instruktaraŭ. Siańnia ŭ Niez. Litwie jość mnoha maładych chłapcoŭ i dziaŭčat, što pakončyli ziamielna-haspadarčyja škoły. Litwa idzie da taho, kab kožny, chto maje być haspadarom na ziamli, skončyŭ takuju i byŭ usiebakowa pryhatawany kulturna wieści haspadarku. Ale jašče nia ŭsio. Zimoj u škołach praz dwa miesiacy adbywajecca tam nawuka ŭsiakaj haspadarskaj raboty.

Dwa hady tamu ŭ Niez. Litwie pačaŭ pracawać i raźwiwacca „Kružok Maładych Haspadaroŭ“, jaki sioleta ŭžo maje 12 tysiač siabroŭ. Siabrami źjaŭlajucca 12—20-letnija chłapcy i dziaŭčaty. Mety hetaha Kružka: 1) wučyć sialanskuju moładź i pakazwać na praktycy, jak treba haspadaryć, 2) budzić siarod hetaj moładzi luboŭ da sialanskaj haspadarki, 3) prywučać moładź da pracawitaści, paradku dziejnaści, da pracy ŭ kooperacyi, da aščadnaści i 4) arhanizaweć, apiortyja na moralnych asnowach, zdarowyja hulni i sport.

U Niez. Litwie ŭ kožnym pawiecie znachodzicca ahranom, jakoha jość abawiazkam rupicca ab padniaćci kultury ziamielnych haspadarak. Pracuje jon nie adzin, a maje cełу rad pamacnikoŭ-specyjalistaŭ u roznych haspadarčych halinach. Usie jany raźjaždžajuć pa wioskach i dajuć ludziam roznyja parady, prabujuć ziarnio, pašu i wučać ludziej, jak naleža haspadaryć, jak wyrablać ziamlu, što siejać i h. d.

Majuć ahranomy takža i inšuju rabotu. Tyja wioski, jakija pašli na chutary, karystajucca nia tolki kamornikam, ale takža i wiedaj ahranoma. Kali kamornik padzielić ziamlu na chutary, tady prybywaje ahranom i paradkuje henyja nowyja haspadarki, wyznačajučy im adpawiednyja dzialanki pad siaŭbu.

Pawiatowyja ahranomy-specyjalisty nia tolki wučać, ale i arhanizujuć roznyja haliny haspadarki, jak hadoŭla žywioły, sadoŭnictwa, harodnictwa, pčalarstwa, budaŭnictwa, wyrab roznych jadomych praduktaŭ, wučać šyć, rabić rukawicy, pančochi, mastackija wytykać tkaniny i h. d.

Takim čynam Niez. Litwa wiadzie haspadaroŭ da taho, kab jany byli sapraŭdy haspadarami kulturnymi i ŭmieli wykarystać usie mahčymaści, što wiaduć ich da dabrabytu.

Haspadary tam usio heta dobra razumiejuć i achwotna i ŭdziačna z rad i pomačy ahranomaŭ i specyjalistaŭ karystajuć.

U wadnym pawiecie Niez. Litwy, u jakim jość 23,789 haspadarak, prad wajnoj haspadary mielisia słaba i z haspadarak swaich jany ledź mahli prakarmicca. A siańnia ŭ henym pawiecie ŭžo jość 24 parawyja małačarni, dźwie matornyja i piać ručnych. U henyja małačarni za minuły hod 16,287 siabroŭ, ułaśnikaŭ 31,612 karoŭ, dastawili 38,457,881 kg. małaka, z jakoha wyrabili 1,596,211 kg. masła, za katoraje atrymali 5,367,275 litaŭ, i wyrabili z hetaha-ž małaka 13,189 kg. syraŭ, za katoryja atrymali 26,348 litaŭ.

Znača, hetkuju sumu hrošaŭ atrymali haspadary ŭ wadnym pawiecie za adno tolki małako“.

Z lit. mowy pierakłaŭ

M. K.

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу! Выпісвайце найстарэйшую беларускую газэту „Беларуская Крыніца“!

і народнае творчасьці; г) заняцьця і пашыраньне спорту і фізычнага выхаваньня ва ўсялякай форме; д) арганізаваньне самапомачы і тавараскага жыцьця.

Апрацаваны статут Т-ва быў паданы на зацьверджаньне Віленскаму Ваяводзе, які зрабіць гэта адмовіўся.

Першая адмова Ваяводства зацьвердзіць статут Т-ва «Будучыня» апіралася на 6 арт. Распараджэньня Ген. Камісара Усходніх Зямель. Справа ў тым, што паводле гэтага распараджэньня да Т-ва ня могуць належыць непоўналетнія, г. зн. тая моладзь, якая ня мае 21 г.; а такжа вучні ніжэйшых школ, што было спрэчна з §§ 10 і 11 статуту Т-ва «Будучыня», паводле якіх сябрамі з правам голасу, выбару і выбіральнасьці магла быць моладзь ад 16 гадоў, а бяз вышэй успомненых правоў — ад 14 гадоў.

Напатыкаючы на гэткія перашкоды статут Т-ва „Будучыня“, закладчыкі датасавалі яго да вышэйуспомненага распараджэньня Ген. Кам. Ус. З., якое чамусьці фактычна абавязвала толькі Таварыства Беларускай Моладзі, бо напр. да такога „Koła Młodzieży Wiejskiej“ можа належыць моладзь ад 16 гадоў, а нават і малодшая, як захоча гэтага ўрад „кола“, з тым, што ў Урад кола выбіраюцца поўналетнія, паводле статуту „Koła Młodzieży Wiejskiej“ зацьверджанага пастановай „Delegata Rządu w Wilnie dn. 16 lipca 1923 r.“ і ўпісанага у „Rejestr Stowarzyszeń: Rejestr L. N. 19. Да „Stowarzyszenia Młodzieży Polskiej“, якім апякуецца віл. арцыб. Ялбжыкоўскі, паводле „Regulaminu Stowarzyszenia Młodzieży Polskiej“, можа належыць моладзь ад 14 гадоў і мець усякія правы, з тым, што ў урад „Стоважышэня“ можа быць выбраны той сябра, які кончыў 17 гадоў.

На ўсё гэта, у свой час, закладчыкамі Т-ва была зьвернута ўвага ваяводзкім уладам пасьля злажэньня да зацьверджаньня статуту Т-ва ўжо папраўленага. Незадоўга прышоў другі адказ, так-жа адмоўны. Гэтым разам ваяводзкія ўлады былі больш адкрытымі і адмову зацьверджаньня статуту Т-ва Бел. Моладзі „Будучыня“ апёрлі на 18 арт. Распараджэньня Ген. Камісара Ус. З., у якім сказана, што начальнік вокругу (ваявода — рэд.) можа статут зацьвердзіць, а можа і не зацьвярджаць.

Пасьля гэтага была падана йшчэ просьба ў Міністэрства Унутраных Спраў аб зацьверджаньні статуту. На заяву гэту атрыманы адказ начальніка бясьпечнасьці Віленскага Ваяводзтва з дн. 23.II.1932 № V. 1433/30, што Мін. Унутр. Спраў пакінула гэту просьбу „bez uwzględnienia“, не падаючы прычын, бо пастанова гэта падлягае зусім свабоднай ацэне ўлады і не вымагае ўмотываваньня („uzasadnienia“).

Гэтак вось закончылася спроба стварэньня арганізацыі беларускае моладзі, а да гісторыі беларускага руху дайшоў яшчэ адзін вымоўны факт аб сапраўдных магчымасьцях культурна-асьветнай працы беларусоў у Польшчы.

„Моладзь — гэта будучыня народу — казаў далей рэфэрэнт — і дзеля гэтага кожны народ стараецца ўзгадаваць сваю моладзь, як найлепш. Ведама, як энэргічна і заўзята за ўзгадаваньне моладзі ўзяліся італьянцы, як шырока распаўсюджаны арганізацыі скаўтаў у Англіі, Вугрыі, Чэхаславаччыне, як у сучаснай Польшчы ўжо сярод вучняў пачаткавых школ працуе над узгадаваньнем яе прыспасабленьне стралецкае, сярод-жа сярэдніх школ — „Straż Przednia“ і «Harcerze», а „Strzelec“, „Stowarzyszenie Młodzieży Polskiej“, «Legjon Młodych», „Związek Młodzieży Wiejskiej „Wici“, „Związek Młodzieży Wiejskiej „Siew“, „Związek Młodzieży Wiejskiej i Ludowej „MłodaWieś“, „Krakusy“, „TUR“ і інш. сярод моладзі вясковай. Гэтыя польскія арганізацыі цэлай парай ідуць і налягаюць на нашыя вёскі і пад плашчом культуры ці хрысьціянства фактычна хочуць сполёнізаваць беларускую моладзь.

„Шлях Моладзі“, як адзіная часопісь для беларускае моладзі, мусіць быць сапраўдным прамянём, які кідаў-бы сьвятло пад вясковыя сялянскія стрэхі, узгадоўваў моладзь на сапраўдных цьвёрдых, ідэовых грамадзян і барацьбітоў за агульна-народны дабрабыт і які давёў-бы моладзь да таго, каб яна сталася сапраўды сакалінай сям'ёй, якая-б падняла народ з нізін дзеля таго, каб заняў ён „свой пачэсны пасад між народамі“.

Гэткага зьместу быў рэфэрат грам. Я. Найдзюка.

Пасьля рэфэрату адбыліся прывітаньні; віталі арганізацыі і адзінкі, з краю і заграніцы, пераважна моладзь і арганізацыі моладзі. Акадэмія закончыласа прыгожым канцэртам, вокальным і інструмэнтальным; беларускі хор пад удатным кіраўніцтвам А. Стэповіча прапяяў некалька мілагучна зrармонізаваных беларускіх песьняў. На перамену з песьнямі дэклямаваліся стройна вершы і была стройная ігра на скрыпцы студ. А. Махонькі пад акомпаніямант фортэпіану.

п.

Kamunisty polonizujuć Uschodniuju Biełaruś.

U toj čaści Biełarusi, jakaja paniawoli apynułasia pad panawańniem Maskwy, jość niamała biełarusaŭ-katalikoŭ. Maskoŭskija cary ŭważali biełarusaŭ-katalikoŭ za palakoŭ, a biełarusaŭ-prawasłaŭnych za maskaloŭ i adpawiedna da hetaha tasawali da adnych i druhich swaju palityku.

Padobnuju palityku prawodziać ciapier i maskoŭskija kamunisty na Biełarusi, tolki inšym ładam. Namieśnik Maskwy ŭ Miensku, palak Dombal, karystajučy z sawiecka-polskaj pryjaźni, biełarusaŭ-katalikoŭ polonizuje z razmacham: zakładajucca polskija škoły ŭ rajonach zasielenych biełarusami katalikami; polski abjezdny teatr raźjaždžaje pa hetych rajonach, pryswojwajučy biełarusam-katalikom polskuju kulturu, a katalickija kaścioły addany pad polskija kluby.

Чарговая Сэсія сьв. Сыноду Праваслаўнай Царквы ў Польшчы.

ПІП (Праваслаўная Інфармацыя Прасова) падае, што дня 1 сакавіка с. г. у Варшаве пачынаецца чарговая сэсія сьв. Сыноду Праваслаўнай Царквы ў Польшчы і што на парадку дня гэтай сэсіі, апрача іншых царкоўных спраў, мае быць і справа вызначэньня на Валынь асобнага праваслаўнага епіскапа. Апошняя гэткая сэсія сьв. Сыноду адбылася 18 ліпня 1933 году, якая зусім нэгатыўна аднеслася да трэбаваньняў Беларусаў, выражаных у мэморыялах і просьбах да вышэйшых духоўных уладаў Праваслаўнай Царквы ў Польшчы.

Дзеля таго, што дамаганьні Беларусаў паданы ў мэморыялах да вышэйшых духоўных уладаў дагэтуль ня зьдзейсьнены, а так-жа ня было на іх і адмовы, беларускае праваслаўнае грамадзьнства чакае вырашэньня пякучых сваіх патрэб у царкоўным жыцьці.

Azijackaje abjednańnie ŭ Sajuz „Wialikaj Azii“.

Niadaŭna adbyłasia ŭ horadzie Dajranie (Azija, Daloki Uschod) ahulna-azijackaja konferencyja pradstaŭnikoŭ niekatorych azijackich krainaŭ. Na hetaj konferencyi ŭ prezydyjum prajšli amal adny japoncy, zajmajučy hałoŭnyja referaty ŭ kamisijach kanhresu. Z inicyjatywy pradstaŭnikoŭ Japonii pryniata pastanowa sklikańnia druhoj wialikaj azijackaj konferencyi ŭ horad Dajran na 1935 h. Henaja konferencyja maje być sklikana pad kličam „Azija dla azijataŭ.“ Padhatoŭka da hetaj konferencyi maje pačacca zaraz i maje abymać nia tolki dziaržawy azijackaha kantynentu, ale i ŭsie krainy Dalokaha Ŭschodu. Dzieła ździejśnieńnia hetaha wialikaha planu zarhanizawana ŭžo na sioletniaj konferencyi specyjalnaja kamisija, na čale z pradstaŭnikom Japonii. Hałoŭnaj zadačaj hetaj kamisii: pašyreńnie świedamaści wa ŭsiej Azii ab patrebie azijackaha abjadnańnia ŭ sajuz „Wialikaj Azii” suproć Eŭropy i Ameryki.

Tajna śmierci karala Belhii Alberta I

i nowy karol Leopold III.

My ŭžo padawali, što 17.II. s h. trahična zhinuŭ u horach karol Belhii Albert I. Trahičnaja śmierć Alberta I dasiul pakryta tajnicaj. Albert I—heta byŭ dziejny i wielmi papularny, nawat siarod socyjalistaŭ, karol. Jon prawodziŭ u Belhii takuju palityku, jakaja mieła zraŭniać u prawoch dźwie nacyi nasielnictwa Belhii: Flamandcaŭ i Walonaŭ Trahičnaja śmierć Alberta pierarwała i jaho dziejnaść. Paśla pachowinaŭ Alberta I na karala Belhii karanawany Leopold III. Hety nowy karol, paśla prysiahi, skazaŭ pramowu pafrancusku (mowa Walonaŭ) i pafiamandzku Hetyja pramowy słuchali ŭsie pasły belhijskaha parlamantu, nawat i kamunisty; nia pryšli witać nowaha karala Belhii tolki flamandzkija separatysty što imknucca da niezaležnaści swajho kraju. Pieśni sałaŭja nia kormiać, a słowy narodu nie zdawolwajuć.

Ziamielnaja reforma ŭ Siaredniaj Eŭropie.

Paśla suświetnaj wajny, padčas paŭstawańnia da wolnaha i niezaležnaha życcia paniawolenych narodaŭ, była padniata sprawa i ziamielnaj reformy. Najbolš aktualnaj heta sprawa była ŭ dziaržawach paŭstaŭšych da życcia na razwalinach pradwajennaha paniawoleńnia. Parlamenty hetych krajoŭ wydali adpawiednyja zakony ab ziamielnaj reformie. Zdawałasia, što sprawiadliwaść pahodzić abšarnika z batrakom i małaziamielnym sialanstwam. Adnak u praktycy heta sprawa pakazałasia nia lohkaj; jaki narod maje bolš radzimaha abšarnictwa, tam ziamielnaja reforma natrapłała na bolšyja pieraškody i tam heta reforma prawiedziena ŭ niaznačnaj miery, a tam, dzie abšarnictwa było čužoje, ziamielnaja reforma prawiedziena ŭ miery dawoli pakazalnaj. I tak, pawodle statystyki, ziamielnaja reforma ŭ Siaredniej Eŭropie za apošnija 10 hadoŭ wyhladaje hetak. U Rumynii: praznačana dla reformy 6.313 tys. hekt. i stolki-ž padzielena; u Čechasławaččynie praznačana 4 081 tys. hekt. a padzielena 1.600 tys. hekt.; u Juhasławii kolki praznačana — niawiedama, a padzielena 1 527 tys. hekt.; u Polščy praznačana 3000 tys. hekt, a kolki padzielena — niawiedama; u Finlandyi praznačana 1825 tys. hekt., a padzielena—niawiedama; u Estonii praznačana—2350 tys. hekt., a padzielena 1850 tys. hekt.; u Łatwii praznačana — 3680 tys. hekt., padzielena 2986 tys. hekt.; u Litwie praznačana—1040 tys. hekt., padzielena 625 tys hekt; u Hrecyi praznačana—1440 tys. hekt., padzielena 750 tys. hekt; u Wuhryi praznačana — 730 tys. hekt., a padzielena — niawiedama.

Z ZAHRANICY.

Balšawiki pratestujuć. Wa ŭsim SSRR. pa haradoch—u fabrykach dy instytucyjach—pratestujuć suproć represijaŭ aŭstryjskaha ŭradu ŭ adnosinach da socyjalistyčnaha „Šucbundu.“ Prymajuć wielmi wostryja rezalucyi. A ŭ siabie doma, hetkich i padobnych socyjalistaŭ, kamunisty, kali nie stralajuć, dyk na Sałoŭki wysyłajuć.

Aŭstryjskija socyjalisty chočuć jechać u SSRR. Uciokšyja ŭ Čechasławaččynu aŭstryjskija socyjalisty chočuć pierajechać u SSRR. Cikawa, ci balšawiki ich prymuć?

Aŭstryjskija narodnyja socyjalisty ab dziaržaŭnych sprawach. Pawadyr aŭstryjskich hitleraŭcaŭ Habicht źwiarnuŭsia praz radyjo da aŭstryjskaha ŭradu z zapytańniem, ci jon zhodzicca supolna z narodnymi socyjalistami šukać lepšaj doli dla aŭstryjskaha narodu i abjadnać Aŭstryju z Niamieččynaj.

Praroctwy dla Francyi. Adzin wybitny francuski piśmieńnik skazaŭ publična: „Urad jaki biezpraryŭna pa bolšwaje swaje daŭhi, dawiadzie dziaržawu abo da bankructwa, abo da rewalucyi ŭ dziaržawie z pryčyny nadmiernych padatkaŭ. — Heta histaryčnaja praŭda. Ale heta praŭda nie pierakonwaje ciapier Francyi.“

Na Dalokim Uschodzie. U Amurskim kraju na st. Archara ŭzarwalisia ŭ sawieckim ciahniku wiezienyja tudy marskija miny. Ciahnik jechaŭ z Pietrahradu ŭ Władywastok Ad jaho nie astałosia i śledu. Zhinuli ŭsie matrosy, što ścierahli toj ciahnik, a tak-ža zhareła stancyja Archara. Usie čyhunačniki tam zahinuli. Dahadwajucca, što ciahnik z minami ŭzarwali paŭstancy.

Z KRAJU.

Bankructwa S.M.P. u Nawahradčynie. Nas infarmujuć što ŭ Nawahradčynie susim zbankrutawała polskaja ksiandzoŭskaja arhanizacyja „Stoważyšenie Młodzieży Polskiej“. Nawat ksiandzy hetaj arhanizacyi wyraklisia i pracujuć u polskaj arhanizacyi „Stoważyšenie Mł. Wiejskiej“.

Kamunistyčny praces u Hłybokim. Nadowiačy Wilenski Akružny sud na wyjazdnoj sesii ŭ Hłybokim zasudziŭ na karu wastrohu ad 5 da 2 hadoŭ 10 asob: 4 biełarusaŭ i 6 żydkoŭ za kamunistyčnuju dziejnaść i prynaležnaść u K.P.Z.B.

Tajnyja brawarki samahonki. U apošnija časy akcyźniki z palicyjaj wykryli na ŭsiej Wilenščynie 17 brawarkoŭ i skanfiskawali kala 500 litraŭ samahonki. Sumnaje heta źjawišča, što ŭ miaścinach zahrožanych hoładam pradukujecca harełka.

Hoład pašyrajecca. Pawodle abličeńnia administracyjnaj ułady ŭ Wilenskim wajawodztwie ciapier haładuje 22.500 asob.

Z WILNI.

Aryšty i štrafy litwinoŭ. Litoŭskija wilenskija hazety apošnim časam šmat pišuć ab aryštach i štrafach siarod litoŭskaha hramadzianstwa. Z hazet hetych dawiedwajemsia, što ŭsich aryštawanych naličajecca da 30 asob i što jość cełу rad asob pakaranych administracyjna štrafam abo aryštam. Administracyjnyja hetyja kary litoŭcy ŭważajuć za biespadstaŭnyja i apelujuć ad ich u Sud.

Wilenskaje radyjo. U wilenskaje radyjo nia ŭsim wolny ŭwachod. Biełarusy tam i nahoj nia bywajuć; za ich bywaje časami chto inšy i niby pabiełarusku piajučy pradstaŭlaje biełarusaŭ. Časami zdarajecca pačuć i z wilenskaha radyjo biełaruskuju pieśniu, ale heta bywaje parodyja, bo kali nie z halicyjskim, dyk z kastramskim akcentam

Prykładam, 25 II. s. h. nadawałasia pawodle prahramy, niby biełaruskaj „co tańczy i śpiewa wieś podwileńka“. Słuchajučy heta, robicca ŭražańnie, što aŭtary hetaj prahramy nia tolki nikoli i ŭ wočy nia bačyli padwilenskaj wioski, ale ab joj nia majuć nijakaha paniaćcia.

Dyk ci nia warta dać dostup da radyja biełaruskim kulturna-praświetnym arhanizacyjam, kab jany prad świetam ad času da času reprezentawali naš kraj —sapraŭdnaj biełaruskaj pieśniaj i naahuł bahataj duchowaj narodnaj kulturaj našaj krainy

Piśmy z wioski.

Našy „krasački.“

U Budsławie, Wialejskaha paw. Letaś polskija wučycieli byli zarhanizawaŭšy h. zw. polski „Uniwersytet Ludowy.“ Śpiarša sioj toj chadziŭ słuchać „wykładów,“ a ciapier i pierastali chadzić. Niekatoryja hety „uniwersytet“ pačali nazywać „kursami polithramaty.“ Adnojčy ŭ hetym „uniwersytecie“ čytaŭ lekcyju ab samaŭradzie miajscowy wojt Rusiecki, a padčas dyskusii pačali hawaryć ab wybarach, jakija adbylisia nia tak, jak wyhladaje pawodle lekcyi wojta Rusieckaha. Na heta lektar adkazaŭ, što hetak robić Musolini i Hitler. U samym razhary dyskusii lektar zajawiŭ, što lekcyja končana i sam wyjšaŭ. Woś dzieła hetaha i pačali hety „uniwersytet“ nazywać „kursami polithramaty.“

Kulinawa, kala Budsława. Woś zdareńnie, pasłuchajcie. 25 studnia s. h. Budsłaŭskija palicejskija pryšoŭšy ŭ hetu wiosku zajšli da Bronisława i Edwarda Chadalonkaŭ (jany siabry Budsłaŭskaha hurtka BIHiK.) i dawaj ich daprašywać: ci naležać ŭ hurtok BIHiK? — adkazali—tak! Ci čytajuć biełaruskija hazety i knižki?—tak! Tady palicejskija dawaj „radzić,“ kab lepš čytali polskija hazety, jakija možna dastawać na pastarunku palicyi, a tak-ža i polskija knižki, bo za biełaruskija moža być .. i jany—palicejskija—buduć čaściej adwiedywać. Zapytywanyja adnak mocna stajali i stajać za swajo. Ale woś cikawa, jakoje dzieła da hetaha palicyi. Spadziajusia, što adpawiednyja ŭłady na heta źwiernuć uwahu i Budsłaŭskaj palicyj rastałkujuć, što nie jaje dzieła, chto jakija čytaje hazety i knižki.

B—k.

Niadobraje źjawišča.

Niachwiedy, Wialejskaha paw., kala Žodzišak. U nas daŭniej zdradnika sialan i z łučynaj było nie znajści, a ciapier nia toje. Ciapier ludzi papsulisia. Ale jak nia psucca, kali ich usiudy psujuć. Woźmiem prykładam apošnija wybary ŭ samaŭrady: kolki napsułasia tut ludzkoj jednaści i stojkaści, dyk i acanić trudna. I što ž z hetaha? Ahulnaje narakańnie i supolnaje niezdawaleńnie: niezdawoleny wybarščyki, što hetak prajšli wybary, niezdawoleny i našyja mužyčki radnyja, što narakajuć na ich susiedzi. A niechta-ž henaje narakańnie adnych na druhich siarod nas pasiejaŭ. Ale ci budzie i jamu heta na karyść?

Braty sialanie! Nie swarems'a miž saboj i adny druhich nie zdradžajma. Wiedajma, što ŭ jednaści siła i što lepšy naš byt zaležyć tolki ad nas samych. Dzieła hetaha treba nie raźjednywacca, a arhanizawacca.

Niachwied.

Sialanskija biedy.

Wiedrowičy, kala Dwarca, Nawahradzkaha paw. Uziaŭsia ja pisać ab sialanskich biedach. Ale chto-ž ich zmoža apisać abo pierakazać. Ciapier hetych biedaŭ u sielanina tak mnoha, što i pieradumać trudna. Jość biedy wialikija, stałyja i ciažkija, jość i drabiaza. Z drabiazoj sialanie dajuć radu—pieramahajuć,—ale biedaŭ wialikich, stałych ci zaŭsiodnych nijak pieramahčy nia mohuć. Biezziamielle, stały zaŭsiodny niedastatak i nadmiernyja padatki sielanina prycisnuli tak mocna, što j dychnuć ciažka.

Jeździć sekwestratar pa wioskach, šukajučy, kab što apisać za padatki, a jaho tolki dzieci bajacca, jakich baćki strašać, kali jany płačuć, bo apisywać za padatki ŭžo niama čaho.

Biedy ŭ nas wialikija i ich treba niejak pieramahčy, bo jany i hroznyja i dakučliwyja.

Špak.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Pierapoŭnieny turmy. Z Waršawy padajuć: wa ŭsiej Polščy ciapier turmy pierapoŭnieny wiaźniami Ułady razhladajuć prajekt ustrymańnia kary da 6 miesiacaŭ turmy. Ciapier jość 12 300 asob zasudžanych na kary ad 3 da 5 miesiacaŭ. Adzin tolki charč wiaźniaŭ kaštuje ŭ hod 6 miljonaŭ zł.

Uradawaja źmiena Premjer polskaha ŭradu Jendžejewič, jaki byŭ adnačasna i ministram aświety, z hetaha apošniaha stanowišča ŭstupiŭ. Na jaho miejsca na ministra aświety naznačany jaho brat, Wacłaŭ Jendžejewič

Zwalnieńnie Krakaŭskaja dyrekcyja čyhunkaŭ zwolniła ŭ swaim wokruzie 800 asob čyhunačnikaŭ. Centralnaja arhanizacyja čyhunačnikaŭ damahajecca ad uładaŭ pawarotu zwolnienych da pracy, ale hetyja damahańni nie pamahajuć sprawie.

Zaniapad šawieckaha ramiasła. Statystyka wykazwaje, što ŭ 1933 h. fabryki wyrabili ŭ Polščy dwa miljony par abutku bolš, čymś u 1932 hodzie. Tymčasam zapatrebawańnie wobuju źmienšyłasia, bo z pryčyny kryzysu ludzi pačali aščadžać i obuj. Šaŭcy nia majuć čaho rabić; fabryka adbiraje rabotu ad ramieśnikaŭ—šaŭcoŭ.

Redaktar: Jan Paźniak Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 3. Wydawiec: A. Šutowič